# АБ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАЙ ГРУПЫ ГІСТОРЫКАЎ ПА СКЛАДАНЫХ ПЫТАННЯХ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІХ АДНОСІН (2010—2015 гг.)

***Снапкоўскі У. Е.,*** *Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*e-mail: ulsnap44@inbox.ru*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

*Разглядаюцца пытанні, звязаныя з пачаткам дзейнасці беларуска- польскай групы гісторыкаў. Артыкул напісаны на падставе дасье (запісак, лістоў і прапаноў) з аўтарскага архіва, што былі накіраваны дэкану факультэта міжнародных адносін БДУ В. Г. Шадурскаму і Пасольству Польшчы ў Беларусі. На думку аўтара, кантакты гісторыкаў дзвюх краін паказваюць, што яны сталі важнай часткай гісторыка-культурнага дыялогу паміж Беларуссю і Польшчай, які аказвае прыкметны ўплыў на ажыўленне і нармалізацыю ўсяго комплекса двухбаковых міждзяржаўных адносін.*

***Ключавыя словы:*** *беларуска-польская група гісторыкаў; беларуска- польская гістарычная камісія; гісторыка-культурны дыялог; складаныя пытанні ў гісторыі беларуска-польскіх адносін.*

У 2011—2015 гг. аўтар прымаў удзел у пачатках дзейнасці беларуска-польскай групы гісторыкаў. Гэта праяўлялася ва ўдзеле ў канферэнцыях і сустрэчах на тэрыторыі Беларусі і Польшчы, выступленнях з дакладамі, паведамленнямі і рэплікамі ў дыскусіях, падрыхтоўцы запісак і лістоў аб стане і перспектывах дзейнасці групы на адрас дэкана факультэта міжнародных адносін БДУ доктара гістарычных навук прафесара Віктара Генадзьевіча Шадурскага, Пасольства Польшчы ў Мінску, перапісцы з беларускімі і польскімі гісторыкамі-ўдзельнікамі групы. У выніку атрымалася архіўнае электроннае дасье па гэтым пытанні, на падставе якога хацелася б падзяліцца сваімі матэрыяламі і ўражаннямі аб першых гадах дзейнасці групы. Наш артыкул можна разглядаць як працяг тэмы, пачатай В. Г. Шадурскім у матэрыяле аб дзейнасці беларуска-польскай гістарычнай камісіі [1].

Ініцыятыва пачатку дыялогу паміж гісторыкамі дзвюх краін належала Пасольству Польшчы ў Мінску і гэты пачатак можна весці з 2010 г. Тады, наколькі гэта нам вядома, польскае пасольства і асабіста пасол Л. Шарепка выступілі з ініцыятывай правядзення сумесных даследаванняў па гісторыі беларуска-польскіх адносін XX ст. Прапанова была звернута да беларускіх гісторыкаў-паланістаў, што працавалі ў вядучых універсітэтах і навуковых установах краіны.

У адказ на яе ў жніўні 2011 г. шэраг беларускіх гісторыкаў прапанавалі польскаму боку тэматыку сумесных першачарговых даследаванняў, прысвечаных перш за ўсё гісторыі беларуска-польскіх адносін XX ст. Дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ В. Г. Шадурскі прапанаваў наступныя тэмы: Беларусь—Польшча: гісторыя без міфаў і спрошчанняў («белых плямаў»); Фактар этнічных меншасцяў у беларуска-польскіх дачыненнях; Беларусі і палякі: механізмы фарміравання і праяўлення этнакультурнай ідэнтычнасці; Досвед мінулага ў свядомасці эліт і масавай грамадскасці Беларусі і Польшчы; Дыялог беларускіх і польскіх гісторыкаў: дасягненні, праблемы, перспектывы. (Беларуская паланістыка і польская беларусістыка: дасягненні, праблемы, перспектывы); Палітыка беларуска-польскага дабрасуседства: падставы і праблемы фарміравання.

Загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. Ф. Скарыны доктар гістарычных навук Р. Р. Лазько лічыў мэтазгодным засяродзіцца на такіх пытаннях, як: Беларусь і суседзі ва ўзаемным успрыяцці ў перыяд фарміравання нацый і нацыянальных дзяржаў; «Вялікая вайна» 1914—1918 гг.: трагедыя і надзея для народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы; Міжнародна-палітычныя сістэмы ў Еўропе ў ХХ ст. і места ў іх краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (Версаль — Тэгеран — Ялта — Патсдам): фарміраванне, эвалюцыя, крах; Па абодвы бакі фронту — стаўленне цывільнага насельніцтва Беларусі да польска-савецкай (польска-бальшавіцкай) вайны 1919—1920 гг.

Загадчык аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі доктар гістарычных навук А. М. Літвін ініцыіраваў для распрацоўкі наступныя тэмы: Польска-беларускія адносіны ў кантэксце часу. Міфы, стэрэатыпы. Навуковыя падыходы. Стан гістарыяграфіі і крыніцазнаўства; Ваенная гісторыя Польшчы і Беларусі: вайсковая справа, вайсковае будаўніцтва, вайсковае майстэрства, постаці ваеннай гісторыі; Польска-савецкая вайна і Беларусь; Польска-беларускія адносіны ў час Другой сусветнай вайны.

Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук А.Ф. Вялікі лічыў прыярытэтнымі для даследавання наступныя пытанні: ХХ ст. — стагоддзе выгнанцаў: Рэпатрыяцыя. Эвакуацыя. Аптацыя. Трансфер. Перамяшчэнні насельніцтва паміж Беларуссю і Польшчай у ХХ ст.; Улада і каталіцкі касцёл у Беларусі ў 1944—1991 гг.; Крыніцы па гісторыі беларуска-польскіх ўзаемадачыненняў у архівах Беларусі і Польшчы; Заходняя Беларусь — «Крэсы Всходне» ў беларускай і польскай гістарыяграфіі, успамінах, мемуарах [2].

Наколькі можна меркаваць, гэтыя прапановы былі ўважліва разгледжаны польскім бокам, аднак ні адна з іх не стала прадметам сумеснага даследавання. Як высветлілася пазней, польскія гісторыкі мелі ўласны праект, які быў прапанаваны беларусам у канцы 2012 г.

У сакавіку 2012 г. група беларускіх гісторыкаў у складзе 8 чалавек наведала па запрашэнні польскага боку з тыднёвым візітам Варшаву і Торунь, дзе азнаёмілася з арганізацыяй навуковых даследаванняў у архівах, бібліятэках і ўніверсітэтах Польшчы. У склад групы ўваходзілі: Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч, доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. А. С. Пушкіна; Анатоль Фёдаравіч Вялікі; Рыгор Рыгоравіч Лазько; Аляксей Міхайлавіч Літвін; Генадзь Мікалаевіч Сагановіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта; Аляксандр Фёдаравіч Смалянчук, доктар гістарычных навук, прафесар, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута славістыкі Польскай Акадэміі навук; Уладзімір Еўдакімавіч Снапкоўскі, доктар гістарычных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта; Захар Васільевіч Шыбека, доктар гістарычных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. Гэта група, як паказалі наступныя падзеі, стала ядром супольнасці беларускіх вучоных, што супрацоўнічалі з польскімі калегамі.

Група мела сустрэчы з кіраўнікам Галоўнай дырэкцыі дзяржаўных архіваў Польшчы праф. Уладзіславам Стэнпнякам, кіраўнікамі і супрацоўнікамі Дзяржаўнага архіва горада Варшавы і Архіва Польскай Акадэміі навук, пазнаёмілася з дзейнасцю польскіх грамадскіх арганізацый у галіне гістарычнай памяці: Цэнтра «Карта» («Усходні архіў», «Спіс рэпрэсіраваных», «Архіў Салідарнасці») і Яўрэйскага гістарычнага інстытута імя Эмануіла Рынгельблюма.

У Торуньскім універсітэце імя Мікалая Каперніка адбылася навуковая сесія «Польска-беларускія адносіны ў кантэксце часу. Міфы, стэрэатыпы. Навуковыя падыходы. Гістарыяграфія і крыніцы», на якой з дакладамі выступілі вучоны сакратар Галоўнай дырэкцыі дзяржаўных архіваў Польшчы Эва Расоўска і дацэнт БДПУ Анатоль Вялікі. На рабочай сустрэчы польскіх і беларускіх гісторыкаў был выработан ряд тематических направлений исследований польско-белорусских отношений в XX в., план сумеснай працы на бліжэйшы час, выбраны сакратары рабочай грыпы (з беларускага і польскага бакоў: адпаведна А.Вялікі і Э. Расоўска), разгледжаны фінансавыя пытанні, звязаныя з дзейнасцю групы.

У лютым 2012 г. напярэдадні візіту ў Польшчу мной быў распрацаваны пералік тэм і праблем для сумеснага даследчага праекта беларускіх і польскіх гісторыкаў па гісторыі беларуска-польскіх адносін (пачатак XX ст. —1945 г.), які быў прадстаўлены для разгляду сябрам беларускай групы гісторыкаў. Дакумент уключаў 20 тэмаў, кожная з якіх распрацоўвалася б сумесна беларускім і польскім аўтарам. Гэта рабілася па прыкладу вядомай расійска-польскай публікацыі «Белыя плямы-чорныя плямы». У прыватнасці першая тэма гучала наступным чынам: «А. Беларускі нацыянальны рух у польскай грамадска-палітычнай думцы пачатку XX ст. (польскі аўтар). Б. Польскі нацыянальны рух у беларускай грамадска-палітычнай думцы пачатку XX ст. (беларускі аўтар)». Другая тэма «А. Абвяшчэнне беларускай дзяржаўнасці (БНР і БССР) і польскі нацыянальны рух (польскі аўтар). Б. Стварэнне польскай дзяржаўнасці і беларускі нацыянальны рух (беларускі аўтар)».

Далейшыя тэмы ахоплівалі такія пытанні, як Беларусь і савецка-польская вайна; Праблема Беларусі на мірных перагаворах у Мінску і Рызе; Рыжскі мірны дагавор і яго рэалізацыя; Праблема вызначэння польскай усходняй мяжы, у тым ліку яе польска-беларускага ўчастка ў 1918—1921 гг.; Дзейнасць Паўнамоцнага прадстаўніцтва (Пасольства) РСФСР—СССР у Польшчы (у тым ліку ўдзел у яго працы беларускіх прадстаўнікоў) і дзейнасць Генеральнага консульства Польшчы ў Мінску (1924—1938 гг.); Праблема Заходняй Беларусі (часткі ўсходніх крэсаў Польшчы) і яе месца ў савецка-польскіх і міжнародных адносінах; Беларуска-польскія эканамічныя, культурныя і навуковыя сувязі ў 1918—1939 гг.; Становішча беларусаў у Польшчы і становішча палякаў у Беларусі; Савецкая ваенная кампанія супраць Польшчы ў верасні 1939 г.: ваенна-палітычныя і дыпламатычныя аспекты; Далучэнне Заходняй Беларусі (беларускіх ваяводстваў Польшчы) да БССР: палітыка-дыпламатычныя і міжнародна-прававыя аспекты; Беларуска-польскія адносіны ў верасні 1939—чэрвені 1941 гг., у тым ліку рэпрэсіі і дэпартацыі палякаў з тэрыторыі БССР, саветызацыя Заходняй Беларусі; Беларускі след у катынскай трагедыі; Беларускае пытанне ў палітыцы польскага эміграцкага ўрада; Дзейнасць Арміі Краёвай на тэрыторыі

Заходняй Беларусі; Праблема вызначэння ўсходняй мяжы Польшчы ў дыпламатыі вялікіх дзяржаў (1941—1945 гг.); Беларуска-польскія пагадненні аб абмене насельніцтвам 1944—1945 гг. і іх рэалізацыя [3].

Сябры групы выказалі сваё прынцыповае адабрэнне прадстаўленаму спісу тэмаў і задавальненне тым, што беларускі бок будзе мець на сустрэчы с польскімі гісторыкамі свае распрацаваныя прапановы. Аднак на сустрэчах у Варшаве і Торуні гэтыя прапановы спецыяльна не разглядаліся і не вылучаліся, паколькі польскі бок ужо меў свой канкрэтны план даследчай працы, які і быў прыняты беларускім бокам.

У кастрычніку 2012 г. у Мінску адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь: Палітыка — Гісторыя — Культура. Гістарычная палітыка як кампанент польска-беларускіх адносін у XX ст. Факты. Падзеі. Памяць. 1921—1939 гг. у гістарычнай палітыцы», арганізаваная Пасольствам Польшчы ў Рэспубліцы Беларусь, Польскім Інстытутам у Мінску і Торунскім універсітэтам імя Мікалая Каперніка. У канферэнцыі прынялі ўдзел і выступілі з дакладамі члены беларуска-польскай групы гісторыкаў. У яе падрыхтоўцы ўдзельнічаў Факультэт міжнанародных адносін БДУ, які разаслаў запрашэнні польскім вучоным і забяспечыў іх месцамі ў гасцініцы БДУ. Аднак па шэрагу прычын, якія засталіся невысветленнымі, кіраўніцтва БДУ было вымушана адмовіцца ад правядзення канферэнцыі на сваёй тэрыторыі. Гэта канечне наклала пэўны адбітак на ўдзельнікаў мерапрыемства.

Нягледзячы на неспрыяльны фон вакол канферэнцыі яе навуковая частка прайшла паспяхова. Беларускія і польскія вучоныя абмеркавалі праблему беларускага катынскага спісу (з удзелам вядомай расійскай даследчыцы Н. С. Лебедзевай і вядомага беларускага даследчыка гэтага пытання І. М. Кузняцова) і пытанні гістарычнай палітыкі ў Беларусі і Польшчы адносна перыяду 1921—1939 гг. Было таксама разгледжана пытанне аб распрацоўцы сумеснага даследчага праекта «Паўночна-заходнія ўскраіны Польшчы перыяду 1921—1939 гг. у польскіх і беларускіх архівах», які пазней атрымаў фінансаванне з боку польскага МЗС (Дэпартамента публічнай ікультурнай дыпламатыі) на 2013 г. [4].

У 2013 г. гэты навуковы праект быў рэалізаваны пад назвай «Польшча — Беларусь. Агульная гістарычная спадчына. Даведнік па архіўных матэрыялах 1918—1939 гг.» У канцы года ў Варшаве выйшаў у свет першы том даведніка, які змяшчаў апісанне фондаў дзяржаўных архіваў Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. У падрыхтоўцы зборніка да друку прынялі ўдзел вучоны сакратар Галоўнай дырэкцыі дзяржаўных архіваў Польшчы Э.Расоўска і беларускія гісторыкі А. Вабішчэвіч, А. Вялікі і А. Смалянчук [5]. У 2014 г. быў падрыхтаваны другі том даведніка, які ўключаў вопіс архіўных фондаў Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Маладзечна, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа, дзяржаўнага архіва Мінскай вобл. [6]. Электронная версія даведнікаў, а таксама база даных па архівах Брэста, Гродна, Маладзечна, Мінска (на польскай і беларускай мовах) даступны ў Інтэрнэце [7].

Беларуская група гісторыкаў-паланістаў дзейнічала як нефармальнае аб'яднанне вучоных і яе агульным жаданнем было атрымаць нейкі фармальны, легальны статус. Яе сябры выказвалі жаданне, каб гру-

па дзейнічала крышай ФМА БДУ, дзе была развіта паланістыка і назапашаны вопыт супрацоўніцтва з польскімі інстытутамі і ўстановамі, асабліва з Інстытутам міжнародных даследаванняў Вроцлаўскага ўніверсітэта. Прапаноўвалася, каб на сайце факультэта размяшчалася інфармацыя аб дзейнасці групы, ее мэтах, задачах, планах і мерапрыемствах. Група магла быць аформлена і зарэгістравана як Цэнтр навуковых даследаванняў Польшчы і беларуско-польскіх адносін у складзе ФМА БДУ. Як вядома, шэраг падобных цэнтраў на факультэце ў той час ужо дзейнічаў. Стварэнне і тэхнічную падтрымку інтэрнет-партала Цэнтра было гатова ўзяць на сябе польскае пасольства ў Мінску. А за прыклад удзельнікі Цэнтра маглі ўзяць працу расійска-польскай групы па складных пытаннях, створаную пры МДІМА (Універсітэце) МЗС Расійскай Федэрацыі.

Як сябра групы і прадстаўнік ФМА аўтар у сваіх лістах да кіраўніка ФМА і Польскага пасольства ставіў пытанне аб тым, каб група выступала ў дыялогу з польскімі калегамі як выразіцельніца інтарэсаў беларускай навуковай супольнасці, для якой найважнейшай задачай з'яўлецца ўстанаўленне гістарычнай праўды пры даследаванні складаных і неадназначных праблем адносін паміж беларускім і польскім народамі на працягу XX ст. Гаворка ішла перш за ўсё аб аказанні дзяржаўнай падтрымкі дзейнасці групы, што адпавядала б інтарэсам беларускай акадэмічнай супольнасці. Як адзначалася ў лісце да дэкана В. Шадурскага і саветніка Пасольства Польшчы ў Беларусі Э. Шчэпаньскай-Дамброўскай ад 30 студзеня 2014 г.: «Это также соответствовало бы и внешнеполитическим интересам Республики Беларусь, принявшей и поддержавшей предложение о научном сотрудничестве со стороны государства — члена Европейского союза, необходимость нормализации отношений с которым постоянно подчеркивается белорусским руководством» [8].

У кастрычніку 2014 г. дэкану ФМА В. Г. Шадурскаму была прадстаўлена «Запіска аб складзе і асноўных кірунках дзейнасці беларускай групы гісторыкаў-паланістаў», дзе змяшчаліся адпаведныя прапановы. У прыватнасці група складалася б з 12 навукоўцаў з ліку універсітэцкіх выкладчыкаў і акадэмічных супрацоўнікаў, а ў яе працы маглі б удзельнічаць прадстаўнікі МЗС Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаўных устаноў краіны, калі палічаць гэта неабходным. Па сваім статусе група ператваралася б у Цэнтр даследаванняў гісторыі Польшчы і беларуска-польскіх адносін у складзе факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Асноўныя кірункі дзейнасці групы ахоплівалі б: 1) Навуковае даследаванне гісторыі Польшчы і беларуска-польскіх адносін, з акцэнтам на XX-пачатак XXI ст., уключаючы актуальную знешнепалітычную праблематыку; 2) сумеснае даследаванне гісторыі беларуска-польскіх адносін з польскай групай вучоных, падрыхтоўка і выданне сумесных публікацый (манаграфій, зборнікаў дакументаў, навукова-папулярнай літаратуры), арганізацыя сумесных канферэнцый і іншых навуковых і грамадска-культурных мерапрыемстваў; 3) Экспертную дапамогу і кансультаванне дзяржаўных структур Рэспублікі Беларусь (Адміністрацыі Прэзідэнта, Нацыянальнага сходу, Міністэрства замежных спраў і іншых міністэрстваў і ведамстваў) і грамадскіх арганізацый па пытаннях гісторыі Польшчы і беларуска-польскіх адносін [9].

Пасля сустрэч, тэлефонных размоў і абмену пасланнямі з сябрамі нашай групы (А. Вялікім і Р. Лазько) быў выпрацаваны пералік тэм, якія маглі б скласці аснову для будучых сумесных праектаў з польскімі гісторыкамі. Гэта быў фактычна наш адказ на польскія прапановы аб даследаванні праблем Катыні, сталінскіх рэпрэсій і дзейнасці Арміі Краёвай у Беларусі. У лютым 2015 г. аўтар прапанаваў дэкану ФМА і польскаму пасольству ў Мінску гэты пералік з 10 тэмаў. Яны датычыліся гісторыі беларуска-польскіх адносін XX ст. і былі сфармуляваны наступным чынам: Адраджэнне беларускай і польскай дзяржаўнасці ў кантэксце нацыя-будаўніцтва ва Усходняй Еўропе (1917—1919 гг.); Беларусь, савецка-польская вайна і Рыжскі мір; Праблемы бежанства, рэпатрыяцыі ваеннапалонных і абмена палітвязнямі ў беларуска-польскіх адносінах (1920 — пачатак 30-х гг.); Беларуско-польскія палітычныя, эканамічныя і культурныя адносіны ў міжваенны перыяд (1921—1939 гг.); Беларусы ў Польшчы, палякі ў БССР у міжвоенны перыяд: параўнальна-гістарычны аналіз; Беларусь у кантэксте вызначэння савецка-польскай мяжы (1941—1945 гг.); Удзел палякаў у антыфашысцкай барацьбе на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны; Рэпатрыяцыя беларускага і польскага насельніцтва ў 1944—1950-я гг.; Беларусы ў ПНР, палякі ў БССР у 1944—1991 гг.: параўнальна-гістарычны аналіз; Беларуска-польскія палітычныя, эканамічныя і культурныя адносіны ў перыя ад «рэальнага сацыялізму» (1944—1989 гг.) [10].

У запісцы таксама было адзначалася, што зараз беларускі бок, кіруючыся адпаведнымі ўстаноўкамі і падыходамі афіцыйнай гістарычнай палітыкі, лічыць немэтазгодным распрацоўку сумесна з польскімі гісторыкамі тэматыкі, звязанай з: 1) катынскім злачынствам сталінскага рэжыму (так зв. беларускі катынскі спіс); 2) уз’яднаннем Заходняй Беларусі з БССР (верасень — лістапад 1939 г.), якое разглядаецца ў Польшчы ў рэчышчы военнай інтэрвенцыі СССР супраць польскай дзяржавы і народа; 3) дзейнасцю Арміі Краёвай на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны.

Аргументуючы гэтую пазіцыю, аўтар канстатаваў, што беларускія гісторыкі маюць па гэтай праблематыцы значны задзел — кнігі, публікацыі дакументаў, навуковыя артыкулы. Таксама падкрэслівалася, што навуковыя пазіцыі часткі з іх (у тым ліку з групы гісторыкаў, якія супрацоўнічаюць з польскімі калегамі) блізкія да тых, што займаюць палякі. Аднак устаноўкі афіцыйнай гістарычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, гістарыяграфічныя падыходы і ацэнкі, сфармуляваныя ў школьных і ўніверсітэцкіх падручніках па гісторыі, грамадская думка, у тым ліку ветэранскіх арганізацый пакуль што не дазваляюць праводзіць па гэтых праблемах адкрытыя навуковыя і грамадскія дыскусіі паміж беларускімі і польскімі гісторыкамі і прадстаўнікаміі грамадскасці дзвюх краін, навуковыя даследаванні з наступнай публікацыяй матэрыялаў. Гэтая праблематыка магла б стаць прадметам уважлівага навуковага вывучэння беларуска-польскай групы гісторыкаў пазней [10]. Такая ж аргументацыя была выкладзена і ў нашым лісце да прафесара Toруньскага ўніверсітэта Збігнева Карпуся ў лютым 2015 г. [11].

На гэтым мая ініцыятыва, звязаная з інфармаваннем. ацэнкамі і прапановамі наконт дзейнасці групы беларускіх гісторыкаў і яе супрацоўніцтва з польскімі калегамі, была скончана, а архіўнае да-

сье па гэтай праблеме вычарпана. Яе вынікі ацаніць даволі складана, аднак зробленую працу напэўна нельга лічыць дарэмнай. Большасць прапаноў не была прынятая і магчыма шэраг з іх (пасля адпаведнай карэкціроўкі) яшчэ чакае свайго часу і рэалізацыі. Некаторыя з іх былі адхілены, адыграўшы на нашу думку ролю выпрабавальнага інструмента.

Як адзначае кіраўнік беларускай часткі двухбаковай камісіі праф. В. Г. Шадурскі, у 2014 г. па ініцыятыве Варшавы была створана беларуска-польская гістарычная камісія, якая імкнецца знайсці ўзаемапрымальны фармат сумеснай дзейнасці і вызначыць тэмы двухбаковай дыскусіі. Па яго словах, першыя кантакты прадстаўнікоў дзвюх краін паказалі, што гістарычны дыялог будзе ўяўляць сабой працяглы працэс з узлётамі і падзеннямі [1, с. 78—79]. Такім чынам, галоўны вынік працы беларускіх і польскіх гісторыкаў заключаецца ў тым, што ўрадавыя ўстановы ў Варшаве і Мінску ў асобе міністэрстваў замежных спраў вырашылі стварыць гістарычную камісію для даследавання складаных (і не толькі) пытанняў гісторыі двухбаковых адносін Беларусі і Польшчы ў ХХ ст. Пачатак яе працы, як і ранейшыя нефармалізаваныя кантакты гісторыкаў дзвюх краін, апісаныя вышэй, паказваюць, што гэта дзейнасць стала важнай часткай гісторыка-культурнага дыялогу паміж Беларуссю і Польшчай, які ў сваю чаргу аказвае прыкметны ўплыў на ажыўленне і нармалізацыю ўсяго комплекса двухбаковых міждзяржаўных адносін.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Шадурский В. Г. От культуры памяти к культуре исторического диалога (на примере деятельности белорусско-польской исторической комиссии) // Беларусь между Востоком и Западом: современные тенденции: материалы междунар. круглых столов, Минск, 26 окт. 2017 г. / БГУ, ФМО; редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. — Минск: Изд. центр БГУ, 2017. — С. 75—85.
2. Предложения белорусских историков-полонистов по тематике совместных исследований с польскими учеными (август 2011 г.) (1 маш. стар.). Перадазена аўтару дэканам факультэта міжнародных адносін БДУ В. Г. Шадурскім // Архіў аўтара.
3. Снапкоўскі, У. Пералік тэм і праблем для сумеснага даследчага праекта беларускіх і польскіх гісторыкаў па гісторыі беларуска-польскіх адносін (пачатак ХХ ст. — 1945 г.). Для сябраў беларускай групы гісторыкаў-паланістаў. 24.02.2012 г. ( 3 маш. стар.) // Архіў аўтара.
4. Снапковский, В.Е. О государственной поддержке деятельности группы белорусских историков-полонистов. Запіска ў адрас Інстанцыі 26.10.2012 г. (2 маш. стар.) // Архіў аўтара.
5. Polska —Białoruś. Wspólne dziedzictwo historyczne. Przewodnik po materiałach archiwalnych 1918—1939=Польшча — Беларусь. Супольная гістарычная спадчына. Даведнік па архіўных матэрыялах 1918—1939 гг. Том 1. Archiwum Państwowe Obwodu Brzeskiego, Archiwum Państwowe Obwodu Grodzieńskiego. — Warszawa: AMALKER, 2013. —360 s.
6. Polska—Białoruś — wspólne dziedzictwo historyczne: przewodnik po materiałach archiwalnych 1918—1939 = Польшча — Беларусь. Супольная гістарычная спадчына. Даведнік па архіўных матэрыялах 1918—1939 гг. Т. 2. Rejonowe Archiwum Państwowe w Mołodecznie, Archiwum Narodowe Republiki Białorusi, Białoruskie Państwowe Archiwum-Muzeum Literatury i Sztuki, Centralna Biblioteka Naukowa im. Jakuba Kołasa = Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа. — Warszawa: Stowarzyszenie Archiwistów Polskich, 2014. —304 s.
7. http://archiwa.gov.pl/wspolne-dziedzictwo/
8. Снапковский, В. Е. О деятельности группы белорусских историков-полонистов. Запіска накіравана дэкану ФМА БДУ В.Г.Шадурскаму і саветніку Пасольства Польшчы ў Беларусі Э.Шчэпаньскай-Дамброўскай 30.01.2014 г. (3 маш. стар.) // Архіў аўтара.
9. Снапкоўкі, У. Е. Запіска аб складзе і асноўных кірунках дзейнасці беларускай групы гісторыкаў-паланістаў. Дэкану ФМА БДУ В.Г.Шадурскаму 18.10.2014 г. (3 маш. стар.) // Архіў аўтара.

10. Снапковский, В. Е. Перечень тем, предлагаемых Польской стороне для совместных исследовательских проектов белорусских и польских историков. Запіска дэкану ФМА БДУ В. Г. Шадурскаму 03.02.2015 г. (2 маш. стар.) // Архіў аўтара.
11. Snapkowski Wl. Oceny i propozycje dotyczące współpracy białoruskich i polskich historyków. List prof. dr. hab. Zbiegniewu Karpusiu od 03.02.2015 (2 masz. str.) // Архіў аўтара.

## ОСВЕЩЕНИЕ НАРРАТИВА ПОЛЬШИ XX В. В РАБОТАХ ИСТОРИКОВ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

***Тихомиров А. В.***, *Белорусский государственный университет,*
*e-mail: tihomirow@list.ru*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

*Раскрываются особенности освещения нарратива Польши XX в. в работах историков Республики Беларусь. Отмечается, что нарратив Польши и польской политики XX в. в историографии Республики Беларусь не сопровождался позитивной коннотацией, многие утвердившиеся в советское время оценки исторических событий, сохранились, несмотря на стремление части белорусских историков, сориентированных на европейский вектор развития Беларуси, изменить ранее сложившуюся парадигму (в частности, это касается оценок положения Западной Беларуси в составе Польши в 1921—1939 гг., событий осени 1939 г. и действий польского сопротивления в Беларуси в конце 1930-х — начале 1950-х гг.). Понимания в белорусском обществе не находит требование польской стороны реабилитировать поляков, ставших жертвами сталинских репрессий в Беларуси в 1930-х — 1950-х гг. Отрицание современными польскими учеными нарратива Польской Народной Республики еще больше отдаляет в концептуальном плане Польшу от Беларуси, исторический нарратив которой в значительной мере выстроен на советском наследии.*

***Ключевые слова:*** *Республика Беларусь; Польша; историография; историческая политика; исторический нарратив.*

Исторический нарратив Польши XX в. в белорусской историографии зачастую сопровождался неоднозначными интерпретациями. Основу соответствующих интерпретаций заложила историография времен Белорусской ССР. В Советской Беларуси Польша первой половины XX в. («белая», «буржуазно-помещичья» и т.п.) представала как агрессор, стремившийся захватить белорусские земли и поработить белорусское население (в первую очередь, крестьянство) практически с момента восстановления независимого польского государства осенью 1918 г. Образ Западной Беларуси (этнически белорусских земель, пребывавших в составе Польши с марта 1921 г. по сентябрь 1939 г.) как «отсталой колонии польского государства» прочно закрепился в белорусской советской историографии. Соответственно, приход Красной армии в сентябре 1939 г. рассматривался как акт исторического возмездия, поспособствовавший воссоединению разделенного белорусского народа. «Сложные» темы (поддержка СССР и БССР антипольского движения в Западной Беларуси в 1920-х гг., создание и ликвидация польских автономных районов в БССР в 1920-х гг., репрессии в отношении польского населения на белорусских землях в 1930-х — 1950-х гг., определение границ между БССР/СССР и Польшей в 1940-х — 1950-х гг., массовые перемещения поляков и белорусов в 1940-х — 1950-х гг., положение белорусов в Польской Народной Республике (ПНР) во второй половине 1940-х — начале 1980-х гг.) в белорусской советской историографии не рассматривались. Специфику имело отражение взаимодействия между БССР и ПНР во второй половине 1940-х — начале 1980-х гг., которое представлялось абсолютно бесконфликтным и высокорезультативным.